# ЛИНГВОКУЛЬТУРНОЕ ОБРАЗОВАНИЕ В СИСТЕМЕ ВУЗОВСКОЙ ПОДГОТОВКИ СПЕЦИАЛИСТОВ

МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Учреждение образования
«Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина»

# ЛИНГВОКУЛЬТУРНОЕ ОБРАЗОВАНИЕ В СИСТЕМЕ ВУЗОВСКОЙ ПОДГОТОВКИ СПЕЦИАЛИСТОВ

Сборник материалов
международной научно-практической конференции

Брест, 17–18 ноября 2011 года

Брест
БрГУ имени А.С. Пушкина
2012

УДК 81+378(063)
ББК 81–5+74.268.1
Л 59

*Рекомендовано редакционно-издательским советом учреждения образования «Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина»*

*Рецензенты:*
доктор филологических наук, профессор,
**В.И. Сенкевич**
кандидат педагогических наук, профессор,
**В.Ф. Сатинова**

*Редколлегия:*
кандидат педагогических наук, доцент **Л.М. Максимук**
кандидат филологических наук, доцент **А.Н. Гарбалев**
кандидат педагогических наук, доцент **Л.Я. Дмитрачкова**
кандидат педагогических наук, доцент **Т.С. Троцюк**

Л 59 **Лингвокультурное** образование в системе вузовской подготовки специалистов : сб. материалов международной научно-практич. конф., Брест, 17–18 ноября 2011 г. / Брест. гос. ун-т имени А.С. Пушкина; редкол.: Л.М. Максимук [и др.]. – Брест : БрГУ, 2012. – 248 с.

ISBN 978-985-473-851-2.

В сборник включены материалы, посвященные актуальным проблемам теории и практики лингвокультурного образования в системе вузовской подготовки специалистов.

Материалы могут быть использованы преподавателями, аспирантами и студентами высших учебных заведений.

Ответственность за языковое оформление и содержание статей несут авторы.

**УДК 81+378(063)**
**ББК 81–5+74.268.1**

**ISBN 978-985-473-851-2**

© УО «Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина», 2012

Итак, символ – особый знак (языковой или неязыковой), наполненный множественным смыслом дискурса. Мы полагаем, что лингвистический, семиологический, культурный, интерактивный, метатекстовый, герменевтический и другие коды способствуют прочтению этих символов в дискурсе. Следовательно, именно с помощью семиологического кода можно прочитать дискурс как совокупность знаков.

Литература

1. Бодрийяр, Ж. Символический обмен и смерть / Ж. Бодрийяр. – М., 2000.
2. Гоббс, Т. Соч. : в 2 т. / Т. Гоббс. – М., 1989. – Т. 1.
3. Леонтьев, А.Н. Деятельность. Сознание. Личность / А.Н. Леонтьев // Избр. психологические произв. : в 2 т. – М., 1983. – Т. 2. – С. 94–231.
4. Мамардашвили, М.К. Символ и сознание. / М.К. Мамардашвили, А.М. Пятигорский. – М., 1997. – С. 99.
5. Маслова, В.А. Лингвокультурология / В.А. Маслова. – М., 2001.
6. Петренко, В.Ф. Конструктивистская парадигма в психологической науке / В.Ф. Петренко // Постнеклассическая психология. – 2004. – № 1.
7. Пирс, Ч.С. Избранные произведения / Ч.С. Пирс. – М., 2000.
8. Сапогова, Е.Е. Ребенок и знак. Психологический анализ знаково-символической деятельности дошкольника / Е.Е. Сапогова. – Тула, 1993.
9. Рикер, П. Конфликт интерпретаций. Очерки о герменевтике / П. Рикер. – М., 1995.

**А.М. ВАБІШЧЭВІЧ**
Рэспубліка Беларусь, Брэст, БрДУ імя А.С. Пушкіна

## ПОЛІЭТНІЧНАСЦЬ І ПОЛІКАНФЕСІЙНАСЦЬ ЯК ТЫПАЛАГІЧНЫЯ РЫСЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСІ

Пры падрыхтоўцы спецыялістаў у ВНУ краіны немалое значэнне мае вывучэнне імі дасягненняў айчыннай гісторыка-культурнай спадчыны. Паводле Закона “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь” ад 9 студзеня 2006 г., гісторыка-культурная спадчына – гэта “сукупнасць найбольш адметных вынікаў і сведчанняў гістарычнага, культурнага і духоўнага развіцця народа Беларусі, увасобленых у гісторыка-культурных каштоўнасцях” [1]. І асабліва важнае значэнне мае засваенне яе тыпалагічных рыс, сярод якіх найперш вылучаюцца поліэтнічнасць і поліканфесійнасць. На працягу стагоддзяў на беларускіх землях узаемадзейнічалі шматлікія этнасы, спалучаліся хрысціянскія (праваслаўныя, каталіцкія, пратэстанцкія), іўдзейскія, ісламскія, язычніцкія і іншыя рэлігійныя ўплывы. На наш погляд, варта вылучыць **7 асноўных этапаў нацыянальна-культурнага развіцця Беларусі: 1) X – першая палова XIII стст.; 2) другая палова XIII–XVI стст.; 3) канец XVI – канец XVIII ст.; 4) канец XVIII – пачатак XX ст.; 5) 1920–30-я гг.; 6) 1940–80-я гг.; 7) з 1991 г.** Для характарыстыкі кожнага з іх прааналізаваны

наступныя параметры: змест эпохі; выразныя тэндэнцыі (тэндэнцыя); пашыраныя мастацкія стылі; канфесійны фактар; моўная сітуацыя; этнічныя супольнасці; дамінуючыя этнакультурныя працэсы.

**1 этап (X – першая палова XIII стст.)** звязаны з існаваннем першых дзяржаўных утварэнняў на тэрыторыі Беларусі (Полацкага, Тураўскага і іншых княстваў). Сярод асноўных тэндэнцый пазначаем адчувальны ўплыў старажытнарускай, візантыйскай культуры. Менавіта тады адбывалася станаўленне і развіццё старажытнарускага мастацтва, фарміраванне першых архітэктурных школ (полацкай, гродзенскай). Якраз тады адбылося прыняцце і распаўсюджванне хрысціянства. Аднак і на працягу наступных этапаў існавала двухвер'е (перапляценне традыцый хрысціянства і язычніцтва). Пашыраныя мовы – стараславянская, царкоўнаславянская, выкарыстоўвалася грэчаскае пісьмо. У этнакультурныя працэсы былі ўключаны ўсходнеславянскія плямёны (крывічы, дрыгавічы, радзімічы і інш.), балцкае насельніцтва. У той час ішло складванне агульнай усходнеславянскай (старажытнарускай) супольнасці.

На працягу **2-га этапу (другая палова XIII–XVI стст.)** беларускія землі з'яўляліся адметнай часткай Вялікага княства Літоўскага. Менавіта тады адбывалася складванне беларускай народнасці. З уключэннем у XVI ст. у працэсы Адраджэння і Рэфармацыі вызначыліся асноўныя тэндэнцыі (полікультурны характар духоўнага жыцця, далучэнне да агульнаеўрапейскіх каштоўнасцей), пашырыліся такія мастацкія стылі, як раманскі, готыка, рэнесансавы стыль. У канфесійным жыцці назіралася далейшае ўмацаванне хрысціянства (праваслаўя) і распаўсюджванне ўплыву Рымска-каталіцкай Царквы (пасля Крэўскай уніі 1385 г.), адбылося ўзнікненне пратэстанцкіх цэркваў. У межах ВКЛ ішло станаўленне старабеларускай мовы, якая мела афіцыйны статус. Актыўна выкарыстоўваліся латынь, польская, царкоўнаславянская мовы, грэчаскае пісьмо і інш. У той час з'явіліся на тэрыторыі Беларусі ўсе традыцыйныя этнічныя супольнасці: палякі, рускія, украінцы, яўрэі, літоўцы, татары, цыганы.

**3 этап (канец XVI – канец XVIII ст.)** разгортваўся ў складзе Рэчы Паспалітай, вылучаўся панаваннем ідэалогіі Контррэфармацыі, на змену якой з сярэдзіны XVIII ст. распаўсюджваліся ідэі Асветніцтва. Адпаведна ў мастацкай культуры пераважала барока, пачаў пашырацца класіцызм. Асноўнымі тэндэнцыямі былі дамінаванне польскага этнакультурнага ўплыву, пашырэнне ідэй еўрапейскага Асветніцтва. Канфесійнае жыццё было даволі складаным: дзяржаўнае патраніраванне Рымска-каталіцкай Царквы; насаджэнне і пашырэнне ўніяцтва; дыскрымінацыя праваслаўных, пратэстантаў. Паланізацыя ахапіла ўсе вышэйшыя слаі грамадства. З 1697 г. адзінай афіцыйнай мовай стала польская. Менавіта таму беларуская мова выкарыстоўвалася толькі ў асяроддзі сялян, мяшчанскага саслоўя. Сярод моў, якія актыўна выкарыстоўваліся, былі латынь, заходнееўрапейскія мовы (нямецкая, італьянская, галандская, французская і інш.).

Акрамя ўжо згаданых традыцыйных этнічных супольнасцей суіснавалі з беларускім народам і некаторыя новыя, сярод якіх былі шатландцы.

У беларускіх і польскіх крыніцах XVI–XVII стст. шатландскіх эмігрантаў называлі шкотамі, шотамі. Яны былі ваеннымі наёмнікамі, дробнымі гандлярамі (прадавалі "рэчы шкоцкія" – ручнікі, рукавіцы, упрыгожванні, венікі, нажы, ніткі, іголкі, панчохі і інш.). Англійскі драматург Дж. Уэбстэр у п'есе "Белы д'ябал" (1610 г.) пісаў пра "40 тыс. шатландскіх гандляроў у Польшчы". Яны сяліліся ў гарадах і мястэчках магнатаў-кальвіністаў (Радзівілаў і інш.). Шатландцы былі асіміляваны мясцовым насельніцтвам.

У час **4-га этапу (канец XVIII – пачатак XX ст.)** беларускія землі ўваходзілі ў склад Расійскай імперыі. Захапіў часткова і эпоху Асветніцтва. Галоўным з'яўлялася фарміраванне беларускай нацыі. Асноўныя тэндэнцыі нацыянальна-культурнага жыцця: паланізацыя; узмацненне рускага ўплыву (русіфікацыя); супрацьстаянне рускага (афіцыйнага) і польскага ўплываў; складванне беларускай нацыянальнай культуры. Афіцыйнай мовай была руская. Акрамя беларускай мовы, якая была пашырана сярод сялян, бытавалі польская, ідыш і іншыя мовы. У 5 беларускіх губернiях у 1897 г. налічвалася больш 80 нацыянальнасцей, з іх пераважала аўтахтоннае насельніцтва: беларусы (65,6 %), яўрэі (14,5 %), рускія (5,9 %), палякі (5,1 %), украінцы (4,6 %) і інш. Нягледзячы на дзяржаўную падтрымку для Праваслаўнай Царквы, захоўвалася поліканфесійнасць (існавалі таксама Рымска-каталіцкая Царква, баптысты, іўдзейская і мусульманская рэлігіі). Сярод мастацкіх стыляў былі класіцызм, рамантызм, рэалізм, эклектыка, ампір, а таксама гістарычныя (рэтраспектыўныя) стылі – неарускі, неаготыка, неараманскі і іншыя.

На працягу **5-га этапу (1920-30-я гг.)** беларуская нацыя была раз'яднана. У 2-х яе частках у нацыянальна-культурным жыцці разгортваліся адрозныя працэсы. **У БССР** ажыццяўлялася нацыянальна-культурнае будаўніцтва. Афіцыйнымі мовамі (1927 г.) былі беларуская, руская, польская, ідыш. У 1920-я гг. пераважала беларусізацыя, у 1930-я гг. – інтэрнацыяналізацыя. Адначасова адбывалася згортванне царкоўнага жыцця, барацьба з рэлігіяй. У **Заходняй Беларусі,** якая знаходзілася ў складзе Польшчы, ішла паланізацыя, падаўленне і абмежаванне беларускай і іншых няпольскіх культур. Афіцыйнай мовай была польская. Даволі неадназначны характар мела канфесійнае жыццё ў заходнебеларускім краі: дзейнічалі праваслаўныя, пратэстанцкія, іўдзейскія, мусульманскія царкоўныя структуры пры выразным узмацненні пазіцыі Рымска-каталіцкай Царквы.

Наступныя вылучаныя намі перыяды нацыянальна-культурнага жыцця разгортваліся (і працягваюць разгортвацца) намаганнямі ўз'яднанай, кансалідаванай беларускай нацыі.

**6 этап (1940-80-я гг.)** быў адметны аднаўленнем і далейшым развіццём БССР. Культурнае жыццё рэспублікі адчувала ўплыў грамадска-палітычных працэсаў у СССР. Адначасова адбывалася ўсесаюзнае і міжнароднае прызнанне беларускай савецкай культуры. У моўнай сферы ўсталяваўся білінгвізм: руская мова як мова міжнацыянальных зносін у межах усяго Савецкага Саюза, беларуская мова як мова тытульнага этнасу. У 1989 г. беларусы складалі 77,86 %, іншыя этнічныя супольнасці: рускія (13,22 %), палякі (4,11 %), украінцы (2,87 %), яўрэі (1,1 %). Супярэчлівы характар мелі этнакультурныя працэсы: інтэрнацыяналізацыя,

асіміляцыя. Акрамя таго, рэальным было абмежаванне, згортванне рэлігійнага жыцця ва ўмовах атэістычнай палітыкі Савецкай дзяржавы.

Сучасны – **7 этап (з 1991 г.)** – гэта якасна новая эпоха, якая разгортваецца ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Нацыянальна-культурнае жыццё вызначаецца цэлым шэрагам тэндэнцый, сярод якіх трэба адзначыць нацыянальна-культурнае адраджэнне, захаванне этнакультурнай самабытнасці ва ўмовах глабалізацыі. З устанаўленнем дзяржаўнага статусу беларускай і рускай моў білінгвізм атрымаў канстытуцыйнае замацаванне. Акрамя беларусаў як большасці (83,72 %) у нацыянальным складзе насельніцтва (2009 г.) сярод 130 нацыянальнасцей прысутнічаюць як традыцыйныя этнічныя супольнасці – рускія (8,26 %), палякі (3,89 %), украінцы (1,67 %), так і новыя этнічныя групы. Коратка нельга даць вычарпальны адказ адносна этнакультурных працэсаў сучаснасці з-за іх разнастайнасці, складанасці і супярэчлівасці. Аднак неабходна выдзеліць нацыянальна-культурнае адраджэнне; пазітыўныя працэсы міжкультурнай камунікацыі; асіміляцыю ва ўмовах глабалізацыі. Станоўчыя змены адбываюцца ў канфесійным жыцці. Узмацніўся рэлігійны фактар у духоўным развіцці грамадства.

У дадатак да характарыстыкі асноўных этапаў нацыянальна-культурнага развіцця Беларусі варта адзначыць і яго дэтэрмінуючыя фактары: узаемадзеянне і сінтэз усходніх і заходніх традыцый; суіснаванне праваслаўя і каталіцызму; наяўнасць ці адсутнасць дзяржаўнасці; геапалітычныя інтарэсы суседніх вялікіх дзяржаў (Расіі і Польшчы); сацыяльна-эканамічныя, палітычныя, этнакультурныя і канфесійныя інтарэсы асобных этнічных, канфесійных і сацыяльных груп (шляхты, магнатаў, духавенства, мяшчанства, сялянства) і інш.

Поліканфесійнасць насельніцтва складвалася на працягу ўсіх этапаў нацыянальна-культурнага развіцця Беларусі. У першабытную эпоху і часткова ў Сярэднявеччы панавала язычніцтва. Кардынальна новы напрамак духоўнага жыцця беларускага насельніцтва пачаўся з прыняццем і распаўсюджваннем хрысціянства. Візантыйска-славянскі фактар быў адчувальным нават у неспрыяльных умовах Рэчы Паспалітай. Пры гэтым трэба ўлічваць доўгатрывалае суіснаванне хрысціянскіх каштоўнасцей і перажыткаў язычніцтва. Нягледзячы на складаны характар міжканфесійных узаемадачыненняў, тым не менш у іх замацавалася на працягу доўгага часу галоўная рыса – верацярпімасць.

У межах ВКЛ Праваслаўная Царква мела трывалыя пазіцыі да канца XVI ст. У 1528 г. 70 % магнатаў, буйных феадалаў з’яўляліся праваслаўнымі. Каля 80 % феадалаў таксама былі праваслаўнымі (ва ўсходніх, паўднёвых паветах – 90 %). Аднак у Рэчы Паспалітай ва ўмовах дыскрымінацыі праваслаўных (“дысідэнтаў”) пазіцыі царквы былі істотна падарваны. У межах Расійскай імперыі Праваслаўная Царква стала часткай бюракратычнага апарату, была падпарадкавана царскаму самадзяржаўю. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што праваслаўе аказала вялікі ўплыў на фарміраванне менталітэту беларусаў. У 1897 г. сярод беларусаў 80 % складалі праваслаўныя, 18 % – католікі.

Прысутнасць Рымска-каталіцкай Царквы на беларускіх землях пачалася пасля Крэўскай уніі 1385 г. У 1387 г. было ўтворана Віленскае біскупства і 7 парафій,

з іх 3 на тэрыторыі Беларусі. Праводзілася касцельнае будаўніцтва. З пашырэннем каталіцтва распаўсюджваліся элементы польскай і заходнееўрапейскай культуры (асвета, культавае і абарончае дойлідства, грамадска-палітычная думка, музыка, тэатр і інш.).

Неадназначнаю ацэнку ў айчыннай гістарычнай навуцы атрымоўваюць вынікі дзейнасці ўніяцкай царквы, заснаванай пасля Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г. і скасаванай у 1839 г. Паводле розных крыніц, да канца XVIII ст. уніятамі былі ад ½ да ¾ жыхароў Беларусі. Спробы адраджэння ўніяцтва адбываліся ў 1920–30-я гг. на тэрыторыі Заходняй Беларусі. На сучасным этапе таксама назіраецца адраджэнне яго традыцый.

Шматлікія пратэстанцкія цэрквы сваю прысутнасць на беларускіх землях пачалі ў эпоху Рэфармацыі, калі ўзніклі кальвінізм, лютэранства. У XIX–XX стст. атрымалі распаўсюджанне разнастайныя неапратэстанцкія плыні (баптызм, адвентызм і інш.).

Згаданыя традыцыйныя хрысціянскія канфесіі цяпер складаюць большасць існуючых у Рэспубліцы Беларусь рэлігійных структур, пра што сведчаць звесткі табліцы 1.

**Табліца 1** – Колькасць рэлігійных абшчын у Рэспубліцы Беларусь (1.01.2007 г.) [2]

| | |
|---|---|
| Праваслаўная Царква | 1437 (2008 г.) |
| Рымска-каталіцкая Царква | 440 |
| Хрысціяне веры евангельскай | 493 |
| Евангельскія хрысціяне баптысты | 267 |
| Адвентысты сёмага дня | 74 |
| Хрысціяне поўнага Евангелля | 54 |
| Стараабрадніцкая Царква | 33 |
| Іўдзейская рэлігія | 29 |
| Лютэранская Царква | 27 |
| Сведкі Іеговы | 26 |
| Мусульманская рэлігія | 24 |
| Новаапостальская Царква | 21 |
| Прагрэсіўны іўдаізм | 17 |
| Грэка-каталіцкая Царква | 13 |

Адначасова з поліканфесійнасцю і ў арганічнай сувязі з ёй складваўся і поліэтнічны склад насельніцтва. Разам з большасцю (беларусамі) пачалося мірнае сужыццё і іншых этнічных супольнасцей (меншасцей). Улічваючы суседства блізкіх славянскіх народаў і іх гістарычныя сувязі (рускіх, украінцаў, палякаў), менавіта з імі беларусы мелі цесныя этнакультурныя кантакты. Пачатак польскай прысутнасці на этнічных беларускіх землях адносяць да XII–XIII стст., калі з'явіліся першыя групы мазураў (мазаўшан). Колькасны рост асоб польскай этнічнай свядомасці адбываўся асабліва ў межах Рэчы Паспалітай, калі рэзка ўзмацніўся польскі этнакультурны ўплыў, усеабдымны характар набыла паланізацыя "вярхоў" грамадства. Так як іміграцыя была істотна абмежавана (статут ВКЛ 1588 г. забараніў чужынцам (польскім феадалам) набываць землі

і займаць пасады ў ВКЛ), то папаўненне ішло за кошт паланізацыі ўласнага насельніцтва. На працягу 6 і 7 этапаў нацыянальна-культурнага развіцця Беларусі палякі займалі (і працягваюць займаць) 3-е месца па колькасці (пасля беларусаў і рускіх): 1959 г. – 6,68 %, 1979 г. – 4,23 %, 1989 г. – 4,11 %, 1999 г. – 395,7 тыс. чал. (3,94 %), 2009 г. – 294,5 тыс. чал. (3 %).

Першыя групы рускіх мігрантаў на тэрыторыі сучаснай Беларусі з'явіліся ў XV–XVI стст. У ВКЛ перасяляліся як добраахвотна (ваеннаслужылыя людзі, панцырныя баяры і інш.), так і вымушана (па палітычных і ідэалагічных меркаваннях – А. Курбскі, Ф. Касой і інш., сяляне, гараджане – з-за феадальнага прыгнёту). У сярэдзіне-другой палове XVII ст. на беларускіх землях з'явілася адметная этнаканфесійная супольнасць – стараабраднікі (стараверы), якія захоўвалі ўласныя традыцыі, рэлігію, звычаі, промыслы і рамёствы (ткацтва, кравецтва, дрэваапрацоўка, пчалярства і інш.). У заснаванай імі ў 1685 г. Ветцы склалася арыгінальная школа іканапісу. Колькасць рускіх павялічылася на працягу 4–6 этапаў нацыянальна-культурнага развіцця Беларусі. Калі ў сярэдзіне XIX ст. яны складалі 1,4 %, то ў 1897 г. – 3,6 % (235 тыс. чалавек, з іх перасяленцы з Расіі (вайскоўцы, землеўласнікі, праваслаўныя святары, чыноўнікі, настаўнікі і інш.) – толькі 38,7 %). Мяркуем, што іх рост ішоў за кошт росту колькасці асоб рускай этнічнай свядомасці з ліку мясцовага насельніцтва. Многія з прадстаўнікоў рускай супольнасці (П. Румянцаў-Задунайскі, І. Паскевіч, З. Чарнышоў і інш.) унеслі значны ўклад у культурнае жыццё Беларусі XIX ст. Хуткі колькасны рост рускіх у складзе насельніцтва Беларусі назіраўся ў савецкі перыяд (асабліва на працягу 6 этапу, пра што сведчаць наступныя лічбы: 1959 г. – 659 тыс. чал. (8,2 %), 1979 г. – 938 тыс. чал. (10,4 %), 1989 г. – 1 млн 134 тыс. чал. (13,2 %), 1999 г. – 1 млн 141 тыс. чал. (11,4 %), 2009 г. – 785 тыс. (8,3 %). Гэта звязана з міжрэспубліканскай міграцыяй працоўнай сілы ў межах СССР, адпаведнымі этнатрансфармацыйнымі працэсамі (інтэрнацыяналізацыяй).

Яўрэі пасяліліся на тэрыторыі Беларусі з канца XIV ст. Яны мірна суіснавалі з беларускай большасцю і іншымі этнічнымі супольнасцямі, але на працягу 2–4 этапаў нацыянальна-культурнага развіцця Беларусі з-заэтнаканфесійных і моўных адрозненняў (прыхільнікі іўдаізму; мовы – ідыш, старажытнаяўрэйская мова), спецыфікі грамадскага жыцця (у межах кагала), рассялення (у гарадах і мястэчках), заняткаў (рамёствы і гандаль) яўрэі трымаліся адасоблена. Рэлігійна-патрыярхальным укладам жыцця выдзялялася мястэчка (на ідыш – "штэтл"). У межах Расійскай імперыі была ўведзена "рыса аседласці" яўрэяў. У 1897 г. у 5 беларускіх губернях яны займалі 2-е месца (пасля беларусаў) – 1 млн 202,7 тыс. (14,5 %). Са скасаваннем "рысы аседласці" у савецкі перыяд і асабліва пасля перажытага яўрэямі генацыду (Халакосту) у гады Вялікай Айчыннай вайны іх адносная прысутнасць у складзе насельніцтва Беларусі значна зменшылася: 1959 г. – 1,86 %, 1979 г. – 1,42 %, 1989 г. – 1,1 %, 1999 г. – 27,8 тыс. (0,28 %), 2009 г. – 12,9 тыс. (0,1 %).

Кантакты беларускага насельніцтва з украінскім пачаліся з канца XIV–XV стст. Кампактныя групы ўкраінцаў пражывалі (і зараз жывуць) на беларуска-ўкраінскім памежжы – у Брэсцкай і Гомельскай абласцях. На працягу 6–7 этапаў

яны займалі (і працягваюць займаць цяпер) 4 месца па колькасці ў нацыянальным складзе насельніцтва Беларусі: 1959 г. – 1,65 %, 1979 г. – 2,42 %, 1989 г. – 2,87 %, 1999 г. – 237 тыс. чал. (2,36 %), 2009 г. – 158,7 тыс. чал. (1,67 %).

Сувязі паміж беларусамі і літоўцамі пачаліся ў XIII–XIV стст. Улічваючы сумеснае пражыванне з беларускім насельніцтвам у межах ВКЛ, наяўнасць літоўцаў (асабліва на беларуска-літоўскім памежжы) уяўляецца заканамернай. Літоўская этнічная група з'яўляецца нешматлікай: 1959 г. – 0,1 %, 1979 г. – 0,07 %, 1989 г. – 0,07 %, 1999 г. – 0,06 %, 2009 г. – 5 тыс. (0,05 %).

Пасяленне татараў на беларускіх землях адбылося пры вялікім князі ВКЛ Вітаўце ў канцы XIV ст. Яны здолелі захаваць рэлігійныя каштоўнасці (іслам), традыцыйную культуру. У ходзе мірнага сужыцця ажыццявілася акультурацыя татараў, засваенне імі мовы мясцовага (беларускага) насельніцтва. Яскравым прыкладам з'яўляюцца кітабы – рэлігійныя кнігі, напісаныя на беларускай мове арабскім пісьмом. Татары таксама з'яўляюцца нешматлікай этнічнай супольнасцю: 1959 г. – 8,7 тыс. чал. (0,11 %), 1979 г. – 0,11 %, 1989 г. – 12,6 тыс. чал. (0,12 %), 1999 г. – 10,1 тыс. чал. (0,1 %), 2009 г. – 7,3 тыс. чал. (0,08 %).

Сярод традыцыйных этнасаў Беларусі трэба адзначыць і цыганоў, якія з'явіліся ў сярэдзіне XV ст. Паводле прывілея вялікага князя ВКЛ Аляксандра (1501 г.), цыганскі войт Васіль атрымаў права вандраваць, мець уласны суд. Колькасць цыганоў невялікая: 1959 г. – 0,06 %, 1989 г. – 0,1 %, 1999 г. – 0,1 %, 2009 г. – 7 тыс. (0,07 %).

Характар міжэтнічных узаемаадносін на працягу ўсіх этапаў сужыцця вызначаўся талерантнасцю, адсутнасцю антаганізму, мірным суіснаваннем, міжканфесійным дыялогам, міжэтнічным і міжкультурным узаемаўплывам. І на сучасным этапе ў нацыянальным складзе насельніцтва Беларусі захоўваецца прысутнасць (сярод прыкладна 130 нацыянальнасцей) менавіта традыцыйных (карэнных) этнічных супольнасцей, пра што яскрава сведчаць звесткі табліцы 2.

**Табліца 2** – Нацыянальны склад насельніцтва Рэспублікі Беларусь (2009 г.) [паводле: 3, с. 7]

| Нацыянальнасць | Колькасць (чалавек) | У % да ўсяго насельніцтва |
|---|---|---|
| Усё насельніцтва | 9 503 807 | 100 |
| беларусы | 7 957 252 | 83,72 |
| рускія | 785 084 | 8,26 |
| палякі | 294 549 | 3,09 |
| украінцы | 158 723 | 1,67 |
| яўрэі | 12 926 | 0,14 |
| армяне | 8 512 | 0,09 |
| татары | 7 316 | 0,08 |
| цыганы | 7 079 | 0,07 |
| азербайджанцы | 5 567 | 0,06 |
| літоўцы | 5 087 | 0,05 |

Адным з важных вынікаў поліэтнічнасці і поліканфесійнасці гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі з'яўляецца складванне тыпалагічных рыс нацыянальнага характару беларусаў: талерантнасць (ад лац. tolerantia – цярпенне),

адкрытасць, арыентацыя на дыялог. Этнакультурная і канфесійная талерантнасць стала характэрнай рысай ментальнасці і нацыянальнага характару беларусаў. Адсутнічалі вострыя, крывавыя этнічныя і канфесійныя канфлікты, міграцыі насельніцтва з-за нацыянальнай ці рэлігійнай нецярпімасці. На працягу ўсіх этапаў адбывалася мірнае суіснаванне нацыянальных супольнасцей, канфесій. Варта падкрэсліць якраз пазітыўны характар міжнацыянальных, міжканфесійных узаемаадносін, іх міжкультурны дыялог, узаемаўплыў. Гістарычнае, геапалітычнае і культурнае знаходжанне на перасячэнні, стыку моцных уплываў розных цывілізацый – найперш праваслаўнай (візантыйска-славянскай) і каталіцкай (лацінска-еўрапейскай), тыпаў хрысціянства прывяло да гарманічнага іх суіснавання на тэрыторыі Беларусі. Гэта і вызначыла асаблівасці гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі: развіццё беларускай культуры ў цесным узаемадзеянні з агульнаеўрапейскім культурным працэсам; існаванне і развіццё беларускай культуры ва ўмовах памежнага цывілізацыйнага (культурнага) ўплыву – з боку славянскай і лацінскай (еўрапейскай) культурных традыцый.

У цэлым, выкладзены змястоўны, актуальны і аб'ектыўны матэрыял пра гісторыка-культурную спадчыну Беларусі (у рамках асобных вучэбных дысцыплін) павінен фарміраваць у выпускнікоў ВНУ цэласнае ўяўленне пра поліэтнічнасць і поліканфесійнасць як важнейшыя дасягненні, якія неабходна выкарыстаць дзеля зберажэння самабытнай нацыянальнай культуры. Улічваючы тое, што культурная разнастайнасць "з'яўляецца агульнай спадчынай чалавецтва і павінна быць прызнана і замацавана на карысць цяперашняга і будучых пакаленняў" (паводле Усеагульнай дэкларацыі ЮНЕСКА аб культурнай разнастайнасці 2001 г.) [4], то ва ўмовах глабалізацыі ўзнятая праблема захавання гісторыка-культурнай спадчыны набывае не толькі агульнанацыянальнае, але і сусветнае значэнне.

Літаратура

1. Нацыянальны прававы інтэрнет-партал Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.pravo.by/ main.aspx?guid=3871&p0=H10600098&p2={NPA}. – Дата доступу : 29.10.2011.

2. Приветствует Беларусь! [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.belarus21.by/ru/main_menu/religion/relig_org/ relig_obsch. – Дата доступа : 27.10.2011.

3. Перепись населения 2009. – Т. III : Национальный состав населения Республики Беларусь / Национальный статистический комитет Республики Беларусь. – Минск, 2011. – 433 с.

4. Арганізацыя аб'яднаных нацый [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.un.org/ru/documents/decl_conv/ declarations/ cultural_diversity.shtml. – Дата доступу : 10.09.2011.